ВОДЗЫЎ
афіцыйнага апанента на дысертацыю
Канстанцінавай Таццяны Леанідаўны
"Абходныя песенна-віншавальныя традыцыі ў каляндарна-абрадавым цыкле Паўночнай Беларусі",
прадстаўленую на саісканне вучонай ступені кандыдата мастацтвазнаўства па спецыяльнасці
17.00.02 – музычнае мастацтва

**1. Адпаведнасць дысертацыі спецыяльнасці і галіне навукі, па якіх яна прадстаўлена да абароны.**

Дысертацыя Т. Л. Канстанцінавай прысвечана ўсебаковаму вывучэнню абходных песенна-віншавальных традыцый як значнай часткі каляндарна-абрадавай культуры Паўночнай Беларусі. Па свайму навукова-тэарэтычнаму і сацыяльна-культурнаму зместу дысертацыя адпавядае спецыяльнасці 17.00.02 – музычнае мастацтва і галіне «мастацтвазнаўства». У рабоце інтэграваны высновы, зробленыя ў наступных галінах даследаванняў па спецыяльнасці «Музычнае мастацтва»: «Этнамузыказнаўства», «Гісторыя беларускай музыкі», «Музычнае краязнаўства» і інш.

2. **Актуальнасць тэмы дысертацыі**.

Нягледзячы на тое, што традыцыйная культура сёння саступае дамінуючыя пазіцыі, фальклор як носьбіт універсальных сэнсаў і агульначалавечых каштоўнасцяў займае сваю нішу ў сучаснай культуры. Найбагацейшая скарбніца абрадава-песенных традыцый беларусаў да гэтага часу не атрымала належнага асэнсавання, тым больш у яе арэальнай прадстаўленасці, з увагай да тэрыторый памежжа, і гэта найперш абумоўлівае высокую ступень надзённасці. Актуальнасць самой тэматыкі даследавання вынікае і з высокай ступені запатрабаванасці раскрыцця этнічнай гісторыі рэгіёнаў, у якой даныя этнамузыказнаўства займаюць даволі трывалыя пазіцыі. Работа ж прысвечана асабліва складанаму культурнаму рэльефу паўночнабеларускага рэгіёна, які сфарміраваўся ва ўмовах медыяльнага становішча на еўрапейскай прасторы.

З іншага боку, актуальнасць працы абумоўлена і неабходнасцю распрацоўкі агульнатэарэтычнай базы айчынных этнамузыказнаўства і фалькларыстыкі. Беларуская навука пaступова засвойвае новыя тэарэтыка-метадалагічныя падыходы, міждысцыплінарнасць фарміруе новыя сферы навуковых ведаў, але пры тым застаецца вельмі шырокае разуменне ўласна арэальных даследаванняў пры адсутнасці размежавання іх з мелагеаграфічнымі, аснову якіх складае картаграфічны метад. Актуальнасць прадстаўленай

дысертацыі яшчэ і ў тым, што сваёй структурай і інтэграцыяй метадаў Т. Л. Канстанцінава прапаноўвае канцэпцыю музычнай арэалогіі.

3. **Ступень навізны вынікаў, атрыманых у дысертацыі, і навуковых палажэнняў, якія выносяцца на абарону.**

Дысертацыя з'яўляецца арыгінальнай, наватарскай кваліфікацыйнай працай, якая вызначаецца глыбінёй пастаўленых задач, доказнасцю іх вырашэння. Найперш, арыгінальнай і доказнай стала рэалізацыя канцэпцыі музычнай арэалогіі, што дазволіла Т. Л. Канстанцінавай здзейсніць менавіта сістэмнае вывучэнне абходных песенна-віншавальных традыцый каляндарна-абрадавага цыкла Паўночнай Беларусі. У рэчышчы канцэпцыі аказалася магчымым стварыць сучасную тыпалогію паўночнабеларускіх калядных і валачобных напеваў, у якой значная ўвага нададзена ладаінтанацыйнаму параметру і лакальнай музычна-стылістычнай спецыфіцы.

Навізной вызначаецца праведзенае значнае па маштабах адлюстраваных фактаў картаграфаванне каранёвых напеваў каляндарна-абрадавага цыкла Паўночнай Беларусі (калядных і валачобных) і ўстанаўленне асобага характару іх арэалаў, для вызначэння якога ўведзены тэрмін *крос-рэгіянальны арэал*. Аўтару належыць досвед гісторыка-культурнай інтэрпрэтацыі атрыманых арэалаў, у выніку якога быў вызначаны статус песенна-абрадавай традыцыі заходнедзвінскага правабярэжжа як архаічнай па фарміраванні цэласнасці, паказана глыбінная сувязь традыцый Беларускага і Рускага Паазер'я на ўзроўні калядных і валачобных абходна-песенных практык.

Дысертацыя Т. Л. Канстанцінавай выступае заўважным унёскам у выпрацоўку новых дэфініцый і тэарэтыка-метадалагічных падыходаў для прэзентацыі ў сучасным навуковым дыскурсе музычнай народнай творчасці беларусаў.

**4. Абгрунтаванасць і дакладнасць вывадаў і рэкамендацый, сфармуляваных у дысертацыі.**

Асноўныя вынікі дысертацыі Т. Л. Канстанцінавай цалкам адпавядаюць палажэнням, вынесеным на абарону. Фарміраванню цэласнасці дысертацыі спрыяла абазнанасць яе аўтара ў працах беларускіх і замежных этнамузыказнаўцаў, улічаны як ужо класічныя, так і больш новыя працы. Цалкам апраўданы зварот да асобных палажэнняў, сфармуляваных прадстаўнікамі сумежных навуковых дысцыплін, у стварэнні панарамнай карціны паўнаначнабеларускага гісторыка-культурнага рэгіёна.

Дакладнасць вынікаў дысертацыі ў многім абумоўленая метадалагічнай гібкасцю, падабранымі і карэктна ўжытымі метадамі даследавання, прычым з

розных галін гуманітарнай веды. У якасці метадалагічнай асновы разгляду абраныя семіятычныя падыходы і агульная тэорыя рытуалу, а функцыянальна-тыпалагічны метад арганічна спалучаецца і ўзаемадапаўняецца музыказнаўчымі метадамі. Аўтар абгрунтоўвае і паслядоўна праводзіць метад дакументальнага картаграфавання. Варта канстатаваць, што ў дысертацыйным даследаванні прадстаўлена абазнанасць аўтара ў сумежных дысцыплінах, што сведчыць аб належнай агульнай кампетэнцыі аўтара.

Дакладнасць высноваў дысертацыі забяспечвае і багатая факталагічная база: гэта ў абсалютнай большасці архіўныя і недрукаваныя запісы, сярод якіх заўважную частку складаюць запісы ўласныя, непасрэдныя назіранні за традыцыяй і прадуманыя інтэрв'ю (ухваляецца прадстаўленасць іх у дадатках).

Такім чынам, і вынікі дысертацыйнага даследавання Т. Л. Канстанцінавай, і рэкамендацыі па практычным выкарыстанні гэтых вынікаў з'яўляюцца абгрунтаванымі і пераканаўчымі.

**5. Навуковая, практычная, эканамічная і сацыяльная значнасць вынікаў дысертацыі з указаннем рэкамендацый па іх выкарыстанні.**

На матэрыяле паўночнабеларускіх абходна-віншавальных напеваў каляндарна-абрадавага цыклу ў дысертацыі рэалізаваны вопыт цэласнага арэальнага даследавання, у якім гісторыка-культурная інтэрпрэтацыя з'яў ажыццяўляецца на аснове тыпалогіі іх арэалаў. Упершыню ў беларускай фалькларыстыцы з пазіцыі музычнай арэалогіі пастаўлена і вырашана пытанне спецыфікі ранняй стадыі фарміравання каляднай і валачобнай песенных традыцый беларусаў. Высокую ступень арыгінальнасці забяспечвае ўлік не толькі сінхроннага зрэзу этнапесеннай традыцыі, але і выкарыстанне прынцыпаў дыяхроннага аналізу, што дазваляе вывучаць архаічныя па паходжанні з'явы ў іх гістарычна абумоўленых межах і дае магчымасць раскрыць паўночнабеларускую песенную сістэму ў аспекце дынамікі гісторыка-культурных пераўтварэнняў.

Дысертанткай на шырокім культурна-гістарычным фоне ўстаноўлены, згодна з геаграфічнай канфігурацыяй, гістарычны адпаведнік арэалу калядных напеваў найбольш архаічнай тыпалагічнай групы – днепра-дзвінская археалагічная культура ў межах III–IV ст. Улік гістарычных праекцый дазволіў ёй патлумачыць фарміраванне больш позніх этнамузычных культурных слаёў як вынік міграцыйных працэсаў.

Несумненную навуковую і практычную значнасць маюць карты, якія дэманструюць пашырэнне пэўных напеваў (гл. Дадатак Г). Аўтарскіх картаў 13 і гэта паказчык крапатлівай і аб'ёмнай працы. Тацццяна Леанідаўна добра ўсведамляе важкасць франтальнага ўліку матэрыялу і дапускае карэкціроўку прадстаўленых даных (с. 23).

Асобна я хачу адзначыць узнятую аўтарам праблему рэлевантнасці ў нарадазнаўчых штудыях адміністрацыйных межаў, як у граніцах краіны, так і на памежжы. Услед за Таццянай Леанідаўнай я паўтараю: “музычна-культурны статус тэрыторый беларуска-рускага памежжа патрабуе пастаноўкі асобнага пытання” (с. 30). Шэраг аспектаў традыцыйнай культуры беларуска-рускага памежжа ўжо абмяркоўваўся ў навуковай літаратуры, аднак практыка замоўчвання агульнай этнічнай гісторыі гэтых тэрыторый дамінуе.

Сацыяльную значнасць набывае інтэрпрэтацыя каляндарна-абрадавага фальклору як знакава апасродкаванай, абумоўленай культурна-гістарычнымі ўмовамі камунікацыі, якая выконвае функцыі трансляцыі духоўнага, эмацыянальна-эстэтычнага і сацыяльнага вопыту. І тады пашырэнне ведаў пра гэтую сферу будзе садзейнічаць рэалізацыі розных функцый у арганізацыі жыцця сучаснага соцыуму. Беларуская каляндарна-песенная традыцыя ацэнена і паказана ў дысертацыі як арганічны і важны рэсурс асэнсавання нацыянальнай этнакультурнай спадчыны.

Як асобны і надзвычай важкі ўнёсак у беларускую фалькларыстыку варта пазначыць факт істотнага пашырэння даследчага поля беларускай фалькларыстыкі праз увядзенне ў навуковы ўжытак архіўных матэрыялаў.

Практычная значнасць вынікаў дысертацыі Т. Л. Канстанцінавай бачыцца ў тым, што ўсе яны будуць запатрабаваныя выкладчыкамі ВНУ для распрацоўкі лекцыйных і практычных заняткаў, а яшчэ яны могуць паслужыць асновай для напісання курсавых і дыпломных работ, магістарскіх і кандыдацкіх дысертацый. У такой жа ступені матэрыялы і вынікі не толькі могуць, але і павінны быць уключаны ў дзейнасць устаноў культуры розных узроўняў.

Праведзена ўкараненне матэрыялаў дысертацыі Т. Л. Канстанцінавай у адукацыйную і культурную прастору Беларусі, што пацвярджаюць пяць адпаведных актаў.

**6. Апублікаванасць вынікаў дысертацыі ў навуковым друку.** Спіс публікацый аўтара, якія адлюстроўваюць навуковыя вынікі дысертацыі, складаецца з 39 публікацый у айчынных і замежных выданнях. Сярод іх 14 артыкулаў у рэцэнзаваных навуковых выданнях, 4 раздзелы ў калектыўных манаграфіях, 4 артыкулы ў навуковых зборніках і часопісах, 1 артыкул у энцыклапедыі, 6 артыкулаў і 2 тэзісаў у зборніках матэрыялаў навуковых канферэнцый, 7 навукова-метадычных электронных выданняў, 1 песенны зборнік. Агульны аб’ём публікацый складае 53,55 аўт. арк. (з іх у сааўтарстве 23 аўт. арк.).

**7. Адпаведнасць афармлення дысертацыі патрабаванням ВАК.** Дысертацыя Т. Л. Канстанцінавай “Абходныя песенна-віншавальныя традыцыі ў

каляндарна-абрадавым цыкле Паўночнай Беларусі” адпавядае патрабаванням Інструкцыі аб парадку афармлення  дысертацыі, аўтарэферата дысертацыі і публікацый па тэме дысертацыі ВАК.

**8. Адпаведнасць навуковай кваліфікацыі саіскальніка вучонай ступені, на якую ён прэтэндуе.**

Усё вышэйсказанае дазваляе сцвярджаць, што навуковыя вынікі, атрыманыя суіскальніцай, з'яўляюцца новымі, арыгінальнымі і важнымі ў развіцці беларускага этнамузыказнаўства. Разам з тым, пры чытанні дысертацыі ўзнікаюць некаторыя пытанні або сумневы, якія большай часткай тычацца прыватных назіранняў і ніяк не мяняюць агульнай высокай адзнакі гэтага даследавання.

1. На с. 18 дысертанстка сцвярджае: “як у этнаграфіі, так і ў фалькларыстыцы, у тым ліку музычнай, абход дагэтуль прадметам спецыяльнага даследавання не стаў”. Аднак у 1980 годзе была абаронена дысертацыя расійскага даследчыка з відавочнай назвай: Анфертьев А.Н. Календарные обходы и мартовская обрядность у народов Восточной Европы: преемственность и этнокультурные контакты: Автореф. дис. на соиск. учен. степ. к. и. н. / АН СССР. ИЭ. Ленингр. часть. Л., 1980, палажэнні якой былі скарыстаныя і Л. М. Вінаградавай, на якую дысертантка якраз і неаднаразова спасылаецца.

Аўтар абгрунтавана абапіраецца на шэраг напрацовак этнографаў і фалькларыстаў у даследаванні каляднай і валачобнай традыцый, але тут яўна не хапае прац беларускіх нарадазнаўцаў, работы якіх толькі ўзбагацілі б даследаванне. Так, цалкам выпушчаны манаграфія Т.І. Кухаронак Маскі ў каляндарнай абраднасці беларусаў. Мн.: Ураджай, 2001, цалкам прысвечаная калядным абходам. Быў бы карысным і том “Масленіца. Абрад. Песні, Напевы”, Мінск: Беларуская навука, 2020, дзе цэлыя раздзелы і адмысловыя серыі картаў прысвечаны масленічным абходам, а таксама шэраг іншых кніг і артыкулаў ад пачатку 2000-х.

2. На фоне абгрунтаванага палажэння аб тым, што абходы выступаюць як сістэмаўтваральны фактар каляндарнай абраднасці Віцебскага Паазер'я, прыкрым падаецца факт ігнаравання зафіксаваных толькі на Віцебшчыне масленкавых абходаў-збіранняў жаночай грамады праз качанне калоды з хаты ў хату; чашніцкіх Розгараў з іх абходам вёскі з адмысловымі спевамі, якія да слова, маюць статус гісторыка-культурнай каштоўнасці Рэспублікі Беларусь; жніўных спарышовых песень і песень-райкоў; урэшце, характэрных толькі для Віцебшчыны і сумежных пскоўскіх тэрыторый абрадаў і песень веснавой талакі. Істотна, што ўсе названыя комплексы з'яўляюцца фактычна этнакультурнымі маркерамі паазерскай традыцыі.

3. Да ліку ўнікальных прылічаны апісаны на с. 62 абрад пакрывання снапа, які пазначаны як той, што "дагэтуль не меў апісанняў у этнаграфічнай літаратуры". Тым не менш аналагічныя звычаі прыведзены і пракаментаваны ў адмысловым артыкуле ў энцыклапедычным выданні "Міфалогія беларусаў", 2011 (с. 343).

4. У якасці дыскусіўнай заўвагі падаецца, што адносна рэдкія фіксацыі калядных абходна-велічальных песень у Паўночнай Беларусі тлумачацца не згасаннем традыцыі, але перанясеннем іх функцыі ў велікодны цыкл і часткова пераймannем абрадавым ігрышчам "Жаніцьба Цярэшкі". Паўднёвая Беларусь практычна не ведае валачобнага абходу і арганічныя гэтаму перыяду абрадавыя семантыку і функцыі сканцэнтравала ў калядных абходах.

5. Як філолаг не магу абмінуць абмылак у напісанні асобных імён і прозвішчаў – В. Іваноў і В. Тапароў (с. 19 і інш.) замест В. Іванаў і У. Тапароў, і асабліва назваў свят з маленькай літары. Пры тым што нарматыўныя слоўнікі (Правілы беларускай арфаграфіі і пунктуацыі, 2010; https://pravo.by/document/?guid=2012&oldDoc=2008-186/2008-186(003-066).pdf&oldDocPage=1) паслядоўна даводзяць напісанне Масленіца, Купалле, Каляды з вялікай літары.

Аднак, дадзеныя заўвагі тычацца не тых раздзелаў дысертацыі, дзе навуковая навізна і значнасць бясспрэчныя, і носяць характар пажаданняў, перш за ўсё больш уважліва паставіцца да напрацовак калег-фалькларыстаў і этнографаў.

Навуковы характар, актуальнасць і наватарства кваліфікацыйнай працы Т. Л. Канстанцінавай, выкарыстаныя дысертанткай метады і прыёмы даследавання, трапныя назіранні і лагічныя высновы, – усё сведчыць аб тым, што навуковая кваліфікацыя саіскальніка адпавядае вучонай ступені кандыдата мастацтвазнаўства.

**Заключэнне**

Падагульняючы вышэй сказанае, можна зрабіць выснову, што дысертацыя Т. Л. Канстанцінавай "Абходныя песенна-віншавальныя традыцыі ў каляндарна-абрадавым цыкле Паўночнай Беларусі" з'яўляецца цікавым, самастойным даследаваннем, якое ўносіць заўважны ўклад у беларускае музыказнаўства.

Вучоную ступень кандыдата мастацтвазнаўства па спецыяльнасці 17.00.02 – музычнае мастацтва можна прысудзіць

ЗА:

доказную характарыстыку абходнага абраду як наважнейшага чынніку арганізацыі каляндарнай абраднасці і звычаёвасці ў цэлым;

вызначэнне спецыфікі музычнага кампанента паўночнабеларускіх калядных і велікодных абходаў у рэаліях XX – XXI стст.;

стварэнне сучаснай тыпалогіі паўночнабеларускіх калядных і валачобных напеваў з увагай да ладаінтанацыйнага параметру і лакальнай музычна-стылістычнай спецыфікі;

цэласнае арэальнае даследаванне паўночнабеларускіх абходна-віншавальных песенных традыцый, картаграфаванне іх тыпаў, вызначэнне структуры і канфігурацыі арэалаў і іх гісторыка-культурную інтэрпрэтацыю;

картаграфаванне каранёвых напеваў каляндарна-абрадавага цыклу Паўночнай Беларусі (калядных і валачобных), абгрунтаванне асобага характару іх арэалаў, для вызначэння якога ўведзены тэрмін крос-рэгіянальны арэал;

доказнае раскрыццё з пазіцыі музычнай арэалогіі спецыфікі ранняй стадыі фарміравання каляднай і валачобнай песенных традыцый беларусаў;

характарыстыку песенна-абрадавай традыцыі заходнядзвінскага правабярэжжа як архаічнай у сваіх вытоках цэласнасці.

Доктар філалагічных навук, прафесар,
загадчык аддзела фалькларыстыкі
і культуры славянскіх народаў Цэнтра
даследаванняў беларускай культуры,
мовы і літаратуры НАН Беларусі Т.В. Валодзіна

УДОСТОВЕРЯЮ